■ Парламенцкі дзённік

# РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

## Савет Палаты прадстаўнікоў разгледзеў графік падрыхтоўкі пытанняў на сесію

**Акрамя таго, на Савеце абмеркавалі план міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва на гэты год. Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў, што чакае сёлета дэпутатаў:**

«Ужо сёння ў нас на разглядзе знаходзіцца 40 законапраектаў, 29 з якіх уключаны ў графік. Тэрміны, устаноўленыя ў ім, павінны няўхільна выконвацца. А тыя праекты, над якімі камісіі яшчэ працуюць, трэба аператыўна дапрацаваць і ўключыць у графік разгляду на гэту сесію. Трэба сур'ёзна павысіць адказнасць дэпутатаў за падрыхтоўку праектаў, а старшыням камісіі больш жорстка кантраляваць гэты працэс».

Акрамя таго, дэпутатаў чакае работа з кодэксамі. А таксама падрыхтоўка законапраектаў па пытаннях, напрыклад, донарства крыві і яе кампанентаў. У працэсе яшчэ шэраг дэпутацкіх ініцыятыў, якія датычацца асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, карэкціроўкі Лясного кодэкса.

За гэты год плануецца правесці парламенцкія слуханні па трох тэмах: энергетыка, інвестыцыі і адукацыя. Старшыня Палаты прадстаўнікоў лічыць, што яны павінны мець практычны вынік у выглядзе рэкамендацый, якія могуць быць улічаны пры падрыхтоўцы законаў. Такі ж падыход павінен прысутнічаць на семінарах, круглых сталах і выязных пасяджэннях — усяго запланавана каля паўсотні мерапрыемстваў.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК** паведаміў, што 11 законапраектаў будуць разгледжаны ў першым чытанні, 17 — паўторна, а яшчэ ў Палату прадстаўнікоў паступіў Дэкрэт № 8. «Я б адзначыў некалькі кірункаў: першае — гэта блок законапраектаў, які звязаны з паляпшэннем эканамічнага становішча ў краіне. Можна было б узгадаць дзяржаўна-прыватнае партнёрства, Банкаўскі кодэкс. Дэкрэт № 8 варты дадатковай увагі, таму што гэта абсалютна новы кірунак, ён практычна закладвае асновы для стварэння новага кодэкса ў развіцці эканамічнага складніка краіны. Будзе цэлы шэраг законапраектаў, якія ў прынцыпе паляпшаюць спажывецкія ўласцівасці. Яны скіраваны на аказанне разнастайных паслуг. Тут можна было б назваць такія, напрыклад, як пітное водазабеспячэнне, — тэма дастаткова актуальная для краіны, якасць харчовых і наогул тавараў, абарона правоў спажыўцоў».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ** расказаў, што летась аўтарытэт парламента значна ўмацаваўся на міжнароднай арэне. Сёлета работа працягнецца, напрыклад, плануецца супрацоўнічаць з Парламенцкай асамблеяй АБСЕ, пачаць актыўна ўзаемадзейнічаць з ПА Савета Еўропы, а таксама з ПА Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора. Нягледзячы на тое, што ў прыярытэце застаецца работа ў рамках структур, створаных на прасторы СНД, пашыраюцца сувязі і з МПА АСЕАН, і з Лацінаамерыканскім парламентам.

Надзея АНІСОВІЧ

■ Погляд



# ЦЭЛЮЛОЗА ПЛЮС ІТ-ТЭХНАЛОГІІ

## Эканамічныя перспектывы 2018 года

**Мінулы год прадэманстраваў значнае паляпшэнне і ўмацаваў сувязі Беларусі з сусветнай эканомікай. Ёсць надзеі на тое, што пазітыўнае развіццё не толькі працягнецца, але і зможа набраць больш хуткія тэмпы. Вынікі 2017 года — рост беларускай эканомікі на 2,4 працэнта. Што можа дазволіць нам выйсці на больш высокі паказчык?**

Перш за ўсё, год пачаўся з найлепшай цаны на нафту за апошнія тры гады. Калі 2016 год стартаваў з крытычна нізкай цаны менш за 30 долараў, то на пачатку 2017 года мы ўбачылі цану ў паўтара раза вышэйшую, а пачатак 2018 года парадаваў павелічэннем цаны ў два з лішнім разы. Для Беларусі гэта крытычна важна, паколькі наша спецыялізацыя — перапрацоўка сырой нафты ў чатырыста відаў тавранай прадукцыі — уносіць вельмі вялікую долю ў беларускі экспарт у цэлым. Нізкія цэны на нафту азначаюць нізкія цэны і на зробленую з яе прадукцыю, што рэзка адкідвае ўніз паказчыкі беларускага экспарту. Пры захаванні цэн на нафту на працягу года ў дыяпазоне 60—70 долараў беларуская эканоміка будзе здольная сур'ёзна прыбавіць. Высокія цэны на нафту таксама азначаюць вялікія стымулы для ўкаранення новых тэхналогій у сектары беларускай нафтаперапрацоўкі і вялікія фінансавыя магчымасці гэта зрабіць. Галоўным з падобных праектаў, вядома, для Беларусі з'яўляецца далейшае пераўзбраенне двух нашых нафтаперапрацоўчых заводаў з тым, каб у 2018—2019 гадах выйсці на ўзровень Германіі па выпрацоўцы светлых прадуктаў з сырой нафты.

У 2018 годзе выходзіць на сур'ёзны ўзровень прамысловая вытворчасць у сферы легкавога транспарту. Сумесны праект Беларусі і адной з найбуйнейшых карпарацый Кітая і свету Geely дазволіць вырабляць не тысячы легкавых машын, як гэта было летась, а дзясяткі тысяч. Пры гэтым асноўная доля павінна пайсці на экспарт, што азначае не толькі прырост эканомікі, але і прыцягненне замежнай валюты, што важна для стабільнасці валютнай сістэмы. А запланаванае ўзрастанне ўзроўню лакалізацыі створыць тысячы новых працоўных месцаў у Беларусі на сумежных прадпрыемствах.

Завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы, пабудаваны на базе ААТ «Светлагорскі ЦКК», таксама выйдзе на поўнамаштабную вытворчасць. Доўгія гады ўкладанняў (па беларуска-кітайскім інвестыцыйным праекце асвоена больш за 850 млн долараў) нарэшце пачнуць прыносіць вынік у выглядзе вялікіх аб'ёмаў гатовай тавранай прадукцыі, запатрабаванай на знешніх рынках. Як вядома, магутнасць вытворчасці складзе прыкладна 400 тыс. тон сульфатнай беленай цэлюлозы, з якіх больш за палову плануецца экспартаваць. Праект не толькі акажа пазітыўны ўплыў на тэмпы росту экспарту, але і дазволіць адмовіцца ад імпарту аналагічнай прадукцыі, таксама ўзрасце ўзровень асваення беларускай драўніны, што карысна для сектара лясной гаспадаркі. Лес пакрывае 40 працэнтаў тэрыторыі Беларусі, і яго выкарыстанне яшчэ не цалкам вычэрпвае ўсе камерцыйныя магчымасці.

Такая ж сітуацыя складваецца і з праектам «Вялікі камень». Доўгія гады планавання, выдзялення зямель пад будаўніцтва, пракладвання першасных камунікацый засталіся ззаду. У 2018 годзе сумесны з Кітаем праект выходзіць ужо на ўзровень, калі пачне даваць аддачу. 2017 год завершаны з 23 рэзідэнтамі, за першыя тры тыдні студзеня іх колькасць узрасла яшчэ на тры. Будзем спадзявацца (калі зыходзіць з усё большай інфармаванасці замежнага бізнесу аб магчымасцях па інвесціраванні ў «Вялікі камень»), што іх колькасць за 2018 год павялічыцца яшчэ на 10—15 як мінімум. Такім чынам, як ужо прынятыя, так і наступныя рэзідэнты стануць будаваць адміністрацыйныя і вытворчыя памяшканні, а таксама вырабляць гатовую прадукцыю і аказваць паслугі, што пазітыўна адаб'ецца на тэмпах беларускай эканомікі.

Адным з самых магутных стымулаў для развіцця беларускай эканомікі можа стаць сектар інфармацыйных тэхналогій. Як сам па сабе, так і гэта ўвага, якая ўжо прыцягнута да Беларусі з-за хуткага ўступлення ў дзеянне (28 сакавіка) Дэкрэта № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі». У выніку яго прыняцця Беларусь становіцца першапраходцам у сферы дзяржаўнага рэгулявання крыптавалют і блокчэйна, і ліберальны характар гэтага рэгулявання выклікае цікавасць да Беларусі па ўсім свеце, якая адаб'ецца станоўча і на іншых сектарах эканомікі.

Пазітывам для Беларусі з'яўляецца і рост цэн на прадукцыю машынабудавання, які пачаўся летась, пры ўмове, што сёлета ён не паверне назад.

У той жа час ёсць і рызыкі, якія таксама вялікія. Сусветная эканоміка ўсё яшчэ нестабільная, а новая халодная вайна Расіі і Захаду будзе па-ранейшаму негатыўна адбівацца на тэмпах развіцця як самой Расіі, так і яе саюзнікаў. Не дадае аптымізму і тое, што нарастае ўзровень канфліктных адносін ЗША з шэрагам краін, а гэта можа негатыўна адбіцца на сусветнай эканоміцы.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■ Блізкая ўлада

# АРЫЕНТАЦЫЯ НА САЦЫЯЛЬНЫ ПАДЫХОД

**Праблемы эксплуатацыі дамоў, добраўпарадкавання вуліц, будаўніцтва дарог, паляпшэння інфраструктуры горада — з такімі пытаннямі звярталіся жыхары Гродна да намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна падчас прыёму грамадзян.**

Свае прапановы, у прыватнасці, агучылі кіраўнікі таварыстваў уласнікаў Сяргей Мікалаевіч і Андрэй Іванавіч. У шэрагу пытанняў — адмена фіксаваных тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, змяненне парадку аказання дадатковых паслуг, утрыманне прыдамавых тэрыторый. На іх думку, варта прывязаць тарыф на асвятленне агульных месцаў і рух ліфта не да колькасці жыхароў, а да плошчы кватэры. У сваю чаргу прэм'ер-міністр задаўся пытаннем: ці абмеркаваны гэтыя ініцыятывы з агульным сходам жыхароў жыллёва-будаўніча-спажывецкага кааператыва і таварыства ўласнікаў.

— У краіне праводзіцца сацыяльная палітыка, якая ўлічвае інтарэсы ўсіх катэгорый грамадзян, — адзначыў Анатоль Калінін. — Мы гэтыя пытанні разглядалі на працягу апошніх чатырох гадоў, працавалі розныя камісіі, былі прыцягнуты ўсе зацікаўленыя структуры, у тым ліку і таварыствы ўласнікаў. У рэшце рэшт прынята такая форма тарыфнай палітыкі, якая задавальняе патрэбы большасці насельніцтва. Затратны механізм кожнай паслугі разлічаны згодна са структурай абслугоўваючых арганізацый. Мы арыентуемся перш за ўсё на асноўныя масы — на дзяржаўныя арганізацыі. Калі б мы арыентаваліся на таварыствы ўласнікаў, тарыфы былі б вышэйшыя. І такі падыход не спадабаўся б насельніцтву.

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што на працягу апошніх двух гадоў затраты ў сектары дзяржаўнага абслугоўвання зніжаны амаль на 200 млн рублёў. У краіне 95 % жылога фонду прыватызавана, таварыствы ўласнікаў пераходзяць на абслугоўванне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У Мінску і некаторых абласных цэнтрах іх колькасць дасягае 40 %. Што датычыцца прывязкі аплаты асвятлення месцаў агульнага карыстання да метражу жылля, гэта пытанне разглядаецца, рашэнне будзе прынята на працягу года.

З прапановай пасадзейнічаць развіццю гродзенскага аэрапорта звярнуўся да віцэ-прэм'ера гараджанін Канстанцін Аляксандравіч. Ён лічыць, што варта адкрываць новыя напрамкі, тым больш, што з гэтага года аэрапорт увайшоў у бязвізавую зону, якую замежныя турысты могуць наведваць да 10 дзён. Анатоль Калінін не бачыць перашкод у арганізацыі маршрутаў. Заканадаўства сёння дазваляе прыняць любога перавозчыка, у тым ліку аператара-лаўкостара. Інфраструктура гродзенскага аэрапорта на дастаткова сучасным узроўні, арганізаваны пастаянныя рэйсы ў Калінінград, а летам — у Балгарыю. І гэту дзейнасць трэба пашыраць, заўважыў віцэ-прэм'ер. Ён падкрэсліў, што для бізнесу важным з'яўляецца наяўнасць пасажырапатоку. Можна сказаць, што тэндэнцыя абнадзейвае. Калі ў 2016 годзе тут было 5 тысяч пасажыраў, то летась ужо ў два разы больш. Чакаецца, што сёлета гэта лічба яшчэ ўзрасце. У сезон магчыма арганізацыя рэйсаў у Варшаву і Вільнюс.

— Важна ўдзяляць увагу не толькі транспарту, але і сферы абслугоўвання, — падкрэсліў Анатоль Калінін. — Неабходна прывесці ў парадак архітэктурныя і гістарычныя помнікі, зрабіць так, каб турыст заставаўся ў Гродне на большы тэрмін.

Маргарыта УШКЕВІЧ

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### РЭКЛАМА БІТКОЙНАЎ ЗАБАРОНЕНА Ў СЕТЦЫ FACEBOOK



Новыя рэкламныя правілы Facebook забараняюць рэкламу прапаноў інвеставання ў біткойны. Адным з самых адмоўных прыкладаў, калі наведвальнік сацсеткі можа быць уведзены ў зман, — гэта прапанова «выкарыстаць пенсійныя назапашванні для куплі біткойнаў». Раней Deutsche Bank таксама не рэкамендаваў рабіць уклады ў крыптавалюце. На думку экспертаў крэдытнай арганізацыі, праблемы крыптавалюты заключаюцца ў высокай валацільнасці і магчымых рызыках у сувязі з маніпуляцыямі коштам, а таксама стратай і крадзяжом інфармацыі.

### У СОЧЫ ПРАЙШОЎ КАНГРЭС СІРЫЙСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДЫЯЛОГУ

Нягледзячы на разыходжанне па многіх пытаннях, яго ўдзельнікі ў Сочы былі адзіныя ў сваім заклiку захаваць тэрытарыяльную цэласнасць краіны і заявілі, што пытанне па форме праўлення павінны вырашаць самі сірыйцы. Як перадае Euronews, складзены спіс кандыдатаў у Канстытуцыйную камісію, якая будзе працаваць у Жэневе. Канчатковае рашэнне па яе складзе павінен прыняць спецпасланнік ААН па Сірыі Стафан дэ Містура.

### ТРАМП НАЗВАЎ ГАЛОЎНЫЯ ПАГРОЗЫ

«Па ўсім свеце мы сутыкаемся з рэжымамі-ізгоямі, тэрарыстычнымі групамі і праціўнікамі накшталт Кітая і Расіі, якія пагражаюць нашым інтарэсам, нашай эканоміцы і нашым каштоўнасцям», — паведаміў прэзідэнт ЗША падчас сваёй прамовы перад кангрэсменамі. У сувязі з гэтым ён заклікаў кангрэс «спыніць небяспечнае зразанне абароннага бюджэту і цалкам прафінансаваць узброеныя сілы ЗША», а таксама пачаць мадэрнізацыю і перабудову ядзернага арсенала краіны.